**У.І.Шаставец**, навуковы супрацоўнік
Нацыянальнага навукова-асветніцкага
цэнтра імя Ф.Скарыны

# "АПОВЕСЦЬ МІНУЛЫХ ГАДОЎ" ЯК КРЫНІЦА РЭЛІГІЙНАЙ ДУМКІ

Выдатны помнік старажытнарускай літаратуры летапісны звод "Аповесць мінулых гадоў" з'яўляецца каштоўнай крыніцай гісторыі станаўлення хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях, крыніцаю сярэднявечнай рэлігійнай думкі.

Помнік дайшоў да нас у дзвюх рэдакцыях і ў некалькіх спісах, скарочана – у шматлікіх гістарычных зборніках і храналагічных кампіляцыях.

"Аповесці" папярэднічалі больш раннія зводы. Гісторыя старажытнага летапісання прадстаўлена А.Шахматавым наступнай схемай. У 1037—1039 гг. быў складзены першы рускі летапіс – Старажытны кіеўскі звод. У пачатку 60-х гадоў XI ст. ігумен Кіева-Пячорскага манастыра Нікан працягваў летапісанне да 1073 г. і склаў другі летапісны звод. У 1093 – 1095 гг. у тым жа Кіева-Пячорскім манастыры быў падрыхтаваны трэці звод, умоўна названы Пачатковым. І ўжо толькі ў пачатку XII ст. Пачатковы звод быў перапрацаваны манахам Кіева-Пячорскага манастыра Нестарам. Гэтую схему прымаюць і іншыя даследчыкі [1].

Лейтматыў "Аповесці" – хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх зямель. Гэтая тэма развіваецца ў святле рэальных гістарычных падзей, розных эпічных паданняў, легендаў, асабістых разважанняў летапісца.

Пачатак аповесці прысвечаны біблейскім падзеям сусветнай гісторыі. Летапісец, апавядаючы пра падзел зямлі паміж сынам Ноя, уводзіць гісторыю Русі ў рэчышча сусветнай гісторыі, надаючы ёй цэнтральнае месца. Асабліва падрабязна ён апісвае Іафетаву частку народаў, выводзячы ўсходніх славян з іафетава калена. У легенду пра Вавілонскае стоўпатварэнне ён уключае радкі: "Разделивше землю, жребьи метавше, не преступати никому же в жребий братень, и живяхо каждо в своей части", мэта якіх – узаконіць тэрытарыяльную недатыкальнасць асобных славянскіх земляў біблейскай традыцыяй.

Апавядаючы пра старажытных славян, аўтар тэндэнцыйна падыходзіць да апісання іх нораваў і звычаяў. "Кроткім" і "ціхім"

---

[1] Повесть временных лет. Ч.2 /Прил. ст. и коммент. Д.С.Лихачева. – М.; Л., 1950. – С. 58.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палянам, якія жывуць па хрысціянскім звычаі, супрацьстаўляюцца дзікія норавы драўлян, радзімічаў, вяцічаў, севяран, крывічоў. Гэтае апісанне нораваў – палемічны выпад супраць устойлівых у славянскім асяроддзі язычніцкіх звычаяў, якія прыпісваюцца варожым у адносінах да палян плямёнам.

З мэтаю пастуліравання факта апостальскага благаславення ўсходнеславянскай зямлі ў апісанне Русі ўстаўлена легенда пра апостала Андрэя. Складзена яна на Русі. Крыніцаю легенды паслужылі візантыйскія дзеі (VIII – IX стст.), у якіх распавядаецца пра місію апостала Андрэя ў Сінапію і ў Корсунь. Легенда прысутнічала ў Пачатковым і ў Старажытным зводах[2]. Візантыя праводзіла погляд на апостала Андрэя як на хрысціянскага асветніка ўсяго Усходу. Але старажытнаруская легенда вядзе Андрэя не ў Візантыю, а ў Рым. Гэтая акалічнасць абумоўлена даўнім часам узнікнення легенды (яшчэ да падзелу цэркваў) або апазіцыйнасцю асяроддзя, у якім яна сфарміравалася, у дачыненні да візантыйскай іерархіі [3].

Гісторыкі лічаць легенду відавочным вымыслам, бо яна прымушае апостала ісці з Корсуня ў Рым шляхам, які не толькі ў 50 разоў даўжэйшы, чым звычайны, але на той час быў проста зусім невядомы [4]. Аднак яна носіць і эвентуальны характар. Існуе думка пра размеркаванне па жэрабі краін апостальскага служэння. Андрэй пайшоў на поўнач праз Ліван да Закаўказзя, Чарнамор'я і Скіфіі. І нават калі ён не дайшоў да ўсходнеславянскіх земляў, гэта не мяняе нашых адносін да яго як да апостала нашых краін і яго да нас як да жаданых духоўных дзяцей [5].

У апавяданні пра стварэнне славянскай граматы аўтар у прапаведнікі хрысціянства сярод старажытных славян, якія, на яго думку, жылі ў Імрыі, залічвае апостала Паўла.

Гістарычны дагавор 945 г. князя Ігара з Візантыяй, пра які паведамляе "Аповесць", сведчыць аб наяўнасці ў асяроддзі рускай знаці значнай хрысціянскай праслойкі. Кіеўскіх хрысціян аўтар падзяляе па этнічнай прымеце на рускіх, варагаў і хазар. Рускім паслам – хрысціянам належала справа вядзення перагавораў: ад іх імя ідзе паведамленне, яны прыносяць прысягу ў Візантыі кіеўскай царквою Св. Іллі і чэсным Крыжом. Ігар жа са сваімі людзьмі –

[2] Шахматов А.А. Разыскания о древнейших русских летописных сводах. – СПб., 1908. – С. 149 – 150.

[3] Карташев А.В. Очерки по истории русской церкви. – М., 1991. – Т. 1. – С. 48 – 49.

[4] Голубинский Е. История русской церкви. – М., 1091. – Т.1. – С.28.

[5] Карташов А.В. Указ. соч. – Т. 1. – С. 51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

язычнікамі ратыфікавалі дагавор у Кіеве, прынёсшы прысягу па язычніцкім звычаі. Е.Галубінскі лічыць, што хрысціяне ў час княжання Ігара маральна ўзвышаліся над язычнікамі і складалі палітычна пануючую партыю, у іх руках знаходзілася вядзенне дзяржаўных спраў [6].

Папярэдніцаю хрысціянізацыі Русі летапісец называе княгіню Вольгу. Ён выводзіць прычыну хросту князёўны з натуральнага духоўнага імкнення чалавека сталага ўзросту да святу, з якім атаясамліваецца хрысціянства, да мудрасці. Наконт даты, месца хросту Вольгі і мэты яе падарожжа ў Канстанцінопаль, пра што паведамляе летапіс, гісторыкі выказваюць розныя гіпотэзы.

Адносіны сына Вольгі, князя Святаслава, да хрысціянства аўтар перадае словамі: “Но аще кто хотяше креститися, не браняху, но ручахуся тому Неверным бо вера хрестьяньска уродьство есть”. Такім чынам, летапісец следам за апосталам Паўлам даводзіць, што хрысціянства з яго этычнымі нормамі змірэння адплаты дабром за зло, незлаблівасці ўспрымалася язычнікамі як юродства, г.зн. як вера людзей, нікчэмных духам. Святаслаў быў язычнікам і, адпаведна язычніцкаму светапогляду, вылучаўся верацярплівасцю, гледзячы на розныя веры як на лепшыя і горшыя, прызначаныя для лепшых і горшых людзей.

Пахвала Вользе як бы вяшчуе будучыя падзеі хросту Русі, дынамічным набліжэннем якіх з'яўляюцца разважанні з нагоды ўрачыстасці д'ябла, змешчаныя ў “Паданні пра першых рускіх пакутнікаў варагаў”. Адпаведна тэксту “Аповесці” руская зямля не ведала вучэння апосталаў і пракораў, але апостальскія трубы апавясцілі хрысціянства ўсяму свету, у тым ліку і Русі.

З годам уступлення Уладзіміра на вялікае княжанне супала легендарная падзея чалавечых ахвярапрынашэнняў. Але, на думку гісторыкаў, у гэтых абставінах няма падставы бачыць доказ асобай язычніцкай набожнасці князя.

Ад “Падання пра першых хрысціян-пакутнікаў” непасрэдна залежыць “Паданне пра хрост Русі”, якое пачынаецца з “выпрабавання вер”. “Выпрабаванне вер” ідэйна скіравана на прапаганду і ўзвелічэнне ўсходняга хрысціянства. Задаючыся мэтаю паказаць візантыйскую веру як самую лепшую, летапісец прымушае паслоў іудзейскага і магаметанскага адлюстроўваць свае веры як негрунтоўныя; пасла рымскага папы выстаўляе “неумеющим глаголати” перад Уладзімірам. У прамове ж візантыйскага філосафа

[6] Голубинский Е. Указ. соч. – Т.1, ч.1. – С. 68.

прыводзяцца галоўныя звесткі па свяшчэннай гісторыі і па дагматах хрысціянства.

Праведнасць візантыйскай веры вылучаецца і шляхам палемічнага "Павучэння супраць лацінян", пададзенага Уладзіміру ўжо пасля хросту корсуньскім епіскапам. У гэтым творы ў скажоным выглядзе падаецца вучэнне Заходняй царквы, прыводзіцца шэраг абвінавачванняў, завершаных агульным прысудам: вучэнне і вера лацінян разбэшчаны нейкім міфічным ерэтыкам Пятром Гугнівым, які прыйшоў у Рым пасля VII Сусветнага сабора і захапіў папскі стол. Гэты тэндэнцыйны твор, на думку даследчыкаў, уведзены ў летапіс правізантыйскай рукою рэдактара Пачатковага зводу і зусім не адлюстроўвае рэальных адносін тагачасных славян да Заходняй царквы [7].

Пасля прамовы філосафа і паказу ім карцін Страшнага суда Уладзімір пагаджаецца на прыняцце веры, але вагаецца і адкладвае хрост на пазнейшы час. У 987 г. ён працягвае выпрабаванне веры, на гэты раз пасольствам у суседнія землі для азнаямлення з формамі рэлігійнай службы. У час аглядання абрадаў выбар веры вызначаецца эстэтычнымі матывамі.

Паводле даследаванняў гісторыкаў, Старажытны звод ставіў хрост Уладзіміра і кіяўлян ва ўзаемасувязі з пропаведдзю візантыйскага місіянера, які называецца то Кірылам, то Канстанцінам [8]. А. Шахматаў лічыць, што "прамова філосафа" была адрасавана балгарскаму цару Барысу, якога Мяфодзій, брат Кірыла, хрысціў пры патрыярху Фоцію; затым яна трапіла на Русь і была прыстасавана да Уладзіміра[9]. З Шахматавым пагаджаюцца і іншыя даследчыкі[10].

Аповесць сведчыць пра бытаванне не менш як трох легенд аб хросце Уладзіміра. Важнай крыніцай, якая дазваляе датаваць хрост князя, гісторыкі лічаць "Памяць і пахвалу Уладзіміру мніха Іакава" (манаха Кіева-Пячорскага манастыра), напісаную ў канцы XII або ў пачатку XIII ст. Гэты помнік адносіць хрост да 987 г., а паход на Корсунь – да 989 г.[11] А. Карташаў, Е. Галубінскі і многія іншыя гісторыкі найбольш верагодным месцам хросту лічаць Васільеў і

---

[7] Голубинский Е. Указ. соч. – Т. 1 , ч. 2. – С. 804.

[8] Шахматов А.А. Указ. соч. – С.147 – 148.

[9] Тамсама. – С.154.

[10] Карташев А.В. Указ. соч. – Т.1. – С.76 – 77.

[11] Зимин А.А. Памяць и похвала Иакова Мниха и житие князя Владимира по древнейшему списку // Краткие сообщения Института славяноведения. – М., 1963. – № 7. – С.72.

адносяць гэтую падзею да 987 г.[12] Аповесць звязвае хрост Уладзіміра з корсуньскім паходам 988 г.

У аснову паведамлення пра корсуньскі паход (захоп Корсуня, жаніцьба князя) пакладзены дакладныя гістарычныя факты, засведчаныя візантыйскімі і арабскімі крыніцамі [13].

Наконт асноўнай мэты паходу Уладзіміра большасць гісторыкаў прытрымліваюцца гіпотэзы, якую можна выкласці ў наступнай паслядоўнасці: Візантыя ў час паўстанняВарды Фокі вымушана была звярнуцца да Уладзіміра за ваеннай дапамогай. Вялікі князь у якасці ўмовы дапамогі запатрабаваў шлюбнага саюзу з Візантыйскім домам. Імператар Васіль ІІ прыняў гэтую ўмову, але, атрымаўшы абяцаную падтрымку, пачаў зацягваць шлюб ці нават адмяніў яго. Уладзімір пайшоў на Корсунь для заваёвы багранароднай нявесты.[14] Існуюць і іншыя меркаванні.[15] У якасці яшчэ адной мэты, засведчанай мніхам Іакавам, гісторыкі лічаць імкненне Уладзіміра прывесці з Корсуня на сваю зямлю хрысціянскіх святароў, якія навучылі б яго людзей хрысціянскаму закону, і заваёву ў Візантыі на правах пераможцы аўтакефальнай незалежнасці для фарміраваўшайся рускай царквы [16]. Царкоўнае ўпраўленне да 1039 г., пра якое нічога не паведамляе летапіс, пакуль што пакрыта цемраю невядомасці. М. Прысялкоў, А. Шахматаў прапанавалі тэорыю: вялікі князь, у адплату візантыйскаму імператару, не ўвёў Рускую царкву ў юрысдыкцыю канстанцінопальскага патрыярха, а замяніў яе іерархічнай залежнасцю ад аўтакефальнай Ахрыдскай (балгарскай) архіепіскапіі[17]. Такой думкі прытрымліваюцца і іншыя гісторыкі: балгарскі прафесар В.Нікалаеў, рускія – акадэмік М. Сперанскі, прафесары М.Леўчанка і А.Карташоў і інш.[18]

---

[12] Карташаў А.В. Указ. соч. – Т. 1. – С. 114.; Голубинский Е. История русской церкви. – Т.1, ч.1. – С.133; Прошин Е. Второе крещение // Как была крещена Русь. – М., 1989. – С.132 – 138; Филист Г.М. Введение христианства на Руси. – Мн., 1988. – С.126 – 132.

[13] Василевский В.Г. Русско-византийские отрывки // ЖПМ. – 1876. – № 3; Повесть временных лет. – Ч. 2. – С. 336 – 337.

[14] Приселков М.Д. Очерки по церковно-политической истории Киевской Руси X – XII вв. – СПб., 1923. – С. 24 -34; Карташев А.В. Указ. соч. – Т. 1. – С. 116; Голубинский Е. Указ. соч. – Т.1 , ч.1. – С. 163; Прошин Г. Указ. соч. – С.135.

[15] Поппэ А. Политический фон крещения Руси // Как была крещена Русь. – М., 1989. – С.227.

[16] Голубинский Е. Указ. соч. – Т.1 , ч.1. – С.129, 158.

[17] Приселков М.Д. Указ. соч. – С. 35 –55.

[18] Боровой В. Значение православной церкви для объединения славянских племён в Восточной Европе – в период Киевской, Литовской (Белорусской) и Московской Руси – в связи с судьбами православия в Белоруссии // Христианизация Руси и белорусская культура. – Мн., 1988. – С. 124. – (Рукапіс.)

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Непасрэднуюо прычыну хросту Уладзіміра аўтар корсуньскай легенды выводзіць з абставін, у якіх хоча засведчыць цуд у славу хрысціянскага Бога.

З Корсуня Уладзімір вяртаецца ў Кіеў, узяўшы з сабою хрысціянскія трафеі і святароў. Гэты факт не выклікае ў гісторыкаў сумнення. Кіяўляне, паводле “Аповесці”, з радасцю прынялі новую веру.

Паводле даследавання А.Шахматава, у аснову “Падання пра хрост Русі” пакладзены два апавяданні пра хрост Уладзіміра. Першае, якое ўтрымлівалася ў старажытным зводзе, уключала апавяданне пра наведванне пасольстваў з прапановаю выбару веры, прамову філосафа, апавяданне пра нараду Уладзіміра з баярамі і старцамі, настаўленне ў веры (у Старажытным зводзе не было другога сімвала веры і палемічнага артыкула супраць лацінян, уведзеных перапрацоўшчыкам Пачатковага зводу), характарыстыку Уладзіміра, скаргу д’ябла, паведамленне пра перадачу дзяцей на вучэнне кніжнае, разважанні наконт хросту, некаторыя рэальныя эпізоды корсуньскага паходу. Другое апавяданне – корсуньская легенда, якая ўзнікла пры Дзесяцінай царкве Св. Багародзіцы не раней другой паловы XI ст. Да корсуньскай легенды адносіцца паведамленне пра ідалапаклонства і іншыя грахі язычніка-князя, корсуньскі паход з эпізодамі перагавораў, хросту, цуднага вылечвання; хрост кіяўлян; паведамленне пра аснаванне і пабудову царквы св. Багародзіцы. [19] На думку ж Ліхачова, корсуньская легенда ўзнікла ў паўночным Прычарнамор’і і была ўведзена ў летапіс Ніканам. [20]

Хрысціянскіх неафітаў летапісец неаднаразова называе новымі людзьмі. Гэты выраз адлюстроўвае сутнасць таінства хросту: паводле хрысціянскага вучэння, апошні сімвалізуе сабою маральную перамену і духоўнае перараджэнне; ён пераўтвараецца ў дзеянне смерці чалавека і яго ўваскрэсення ў Хрысце, становіцца новым нараджэннем вадою і Святым Духам у Царства Божае.

Хрост кіяўлян выклікае скаргу д’ябла, якая ідэйна скіравана на ўзвелічэнне ўсходнеславянскай зямлі і ўслаўленне яе хрысціцеля, справа якога прыраўніваецца да подзвігу апосталаў і пакутнікаў: “Побежен есьм от невегласа, а не от апостол, ни от мученик”.

Уладзімір пражыў у хрысціянстве 28 гадоў, і смерць князя амаль сінхронная смерці яго малодшых сыноў, першых кананізаваных рускіх святых Барыса і Глеба. Летапісец перадае гэтыя падзеі праз

[19] Шахматов А.А. Указ. соч. – С. 134 – 159.

[20] Повесть временных лет. – Ч. 2. – С. 81, 336.

“Паданне пра Барыса і Глеба”. Ідэя падання – праслаўленне братняй любові, асвячэнне іерархічнага прынцыпу наследавання княжацкай улады, які гемалагічны прынцыпу царкоўнай іерархіі. “Аповесць” прыводзіць і дастатковыя падставы для кананізацыі Барыса і Глеба: пакутніцкая смерць, нятленне цела, выпадкі цудатварэнняў.

Хрысціянізацыя ўсходнеславянскай зямлі ў часы Яраслава Мудрага і Усяслава Чарадзея падаецца летапісцам як інтэгральны працэс пашырэння культавага будаўніцтва, мастацкага ўпрыгожання храмаў, развіцця асветы шляхам памнажэння кніжак, павелічэння колькасці святароў, забеспячэння царквы матэрыяльнымі сродкамі.

Гэтыя акалічнасці абумоўліваюць хрысціянізацыю і як з’яўленне ўсё большай колькасці новых людзей, здатных на перамогу над падкопамі ворага.

Летапісец прыводзіць звесткі і пра Кіева-Пячорскі манастыр, духоўны цэнтр усходніх славян, пра яго насельнікаў. Манастыр як духоўны дарадца праводзіў незалежную ад вялікіх князёў палітыку: выступаў супраць княжацкіх усобіц, супраць парушэння князямі хрысціянскай клятвы крыжацалавання; аказаў падтрымку Усяславу Полацкаму. Цесную ўзаемасувязь з Кіева-Пячорскім манастыром падтрымліваў і Глеб Усяслававіч Мінскі. Ён, паводле “Аповесці”, пабудаваў у манастыры трапезніцу. А Іпацьеўскі летапіс паведамляе і аб далейшых яго ўкладах у манастыр. За такую любоў да святой абіцелі Глеб разам з жонкай, дачкой Яраполка Ізяслававіча, былі пахаваны побач са святым Феадосіем. Але набожнасць не перашкаджала Глебу ваяваць з Кіеўскім княствам.

З гісторыяй Кіева-Пячорскага манастыра Нестар спалучае жыццеапісанне Феадосія Пячорскага.

Паказваючы, адпаведна хрысціянскаму погляду, паходжанне дабра ад Бога, а зла, граху ад д’ябла, летапісец да катэгорыі зла прылічвае і княжацкія ўсобіцы. “Павучэнне пра кары Боскія” зусім не выпадкова ўстаноўлена ім у раму бітвы на Нямізе, паланення і ўакняжання ў Кіеве Усяслава Полацкага. Адзначыўшы нашэсце полаўцаў на Кіеўскія землі пасля падзей 1067 г., аўтар развівае правідэнцыяльны погляд на падзеі гісторыі: кара Боская ў выглядзе нашэсця полаўцаў 1068 г. дэтэрмінуецца грахом усобнай раці. Да Божых кар, пасланых людзям за іх грахі, апроч нашэсця іншаплямённікаў, прылічаны смерць, голад, засуха, гібель ураджаю і інш. Адпаведна з рэлігійным поглядам летапісца, душа, якая прыняла ад Бога пакаранне на зямлі, аслабаняецца ад граху і ад далейшага пакарання ў будучым жыцці: “Не мстит бо Господь дважды о том”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да катэгорыі зла летапісец адносіць забойствы, кровапраліцце, спрэчкі, зайздрасць, нянавісць, паклёпы, язычніцкія абрады і звычаі, прымхі, ненаведванне цэркваў. Да катэгорыі дабра – спагнанне суда і збаўленне пакрыўджаных, пакаянне, адмаўленне ад аплаты злом за зло і паклёпа на паклёп, любоў да Госпада, пост.

А.Шахматаў лічыць, што "Павучэнне пра кары Боскія" адносіцца да ліку слоў, складзеных святым Феадосіем Пячорскім, які ў 1068 г. быў ігуменам Кіева-Пячорскага манастыра. [21]

Правідэнцыяльны погляд на лёс краіны развіваецца Нестарам і ў кантэксце, аднесеным да каінавых задумак Святаполка: «И нача помышляти, яко "Избью всю братью, и прииму власть русьску един". Помыслив высокоумием своим, не ведый, яко Бог даеть власть, ему же хощеть; поставляет бо цесаря и князя вышний, ему же хощеть дасть. Аще бо кая земля управится пред Богом, поставляеть ей цесаря или князя праведна, любяща суд и правду, и властителя устраяеть, и судью, правящаго суд. Аще бо князи правьдиви бывають в земли, то многа отдаются согрешенья земли, аще ли зли и лукави бывають, то болше зло наводить Бог на землю, понеже то глава есть земли. Тако бо Исаия рече: "Согрешиша от главы и до ногу, еже есть от цесаря и до простых людий"» (IC.24:2). Тут даводзіцца думка, што добрыя або злыя правіцелі ў розных землях пастаўляюцца Богам у адпаведнасці з заслугамі людзей: праведны кіраўнік, наяўнасць заслуг людзей перад Богам, водпуск грахоў краіне дэтэрмінуюцца адно другім, як і злыя правіцелі, грахоўнасць людзей і кара Гасподняя яшчэ большым навядзеннем зла на пэўную зямлю.

З асобай сімпатыяй адносіцца летапісец да Полацкага князя Усяслава. Аслабаненне яго з паруба і ўвакняжанне ў Кіеве аўтар звязвае з праяўленнем трансцэндэнтнай сілы Крыжа Хрыстова, папранага ворагамі Усяслава, народжанага, паводле "Аповесці", "у сарочцы". Словы ж з тэксту "его же роди мати от волхованья…", на думку даследчыкаў, належаць пяру наўгародскага летапісца, бо менавіта Ноўгарад найбольш цярпеў ад нападаў Усяслава[22]. Тэкст з адмоўнай характарыстыкай князя сведчыць пра кампілятыўнасць летапіснага жанру, пра сімбіёз хрысціянскіх і язычніцкіх уяўленняў, і яго нельга трактаваць як адмоўнае стаўленне аўтара "Аповесці" да Усяслава Чарадзея.

---

[21] Шахматов А.А. «Повесть временных лет» и ее источники // Тр. отдела древнерусской литературы. – М., 1940. – Т. 4. – С. 109.
[22] Шахматов А. Указ. соч. – С. 180.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пад 1092 г. у “Аповесці” змешчана легенда “О превидном чюде у Полотьску”. Гэтая гісторыя была занесена і ў шэраг іншых летапісаў (Іпацьеўскі, Густынскі, Цвярскі, Радзівілаўскі і інш.). Яна адлюстроўвае архаічныя вераванні аб паходжанні хвароб ад уздзеяння злых сіл. Легенда, на думку аўтара гэтага артыкула, хутчэй за ўсё мясцовага паходжання, бо бадай ні адна частка славянскага свету не выпрацавала настолькі падрабязнай дэманалагічнай класіфікацыі, як Віцебшчына[23]. Паводле паазёрскіх вераванняў, адной са шматлікіх праяў нячыстай сілы былі “паветрыкі”, якія дзейнічалі скопам праз няроўныя прамежкі гадоў; яны прыпадалі да ахвяры выпадкова, не шукаючы яе, і наносілі шкоду галоўным чынам толькі целу. На Міншчыне “паветрыкі” ўяўляліся персаніфікаванымі хваробамі, занесенымі ветрам з-за мора, з гор, з лесу, балотаў па волі Боскай ці па насланні чараўнікоў, увасаблялі сабою галоўным чынам эпідэмічныя хваробы (мор, чуму, халеру, воспу і інш.) [24]. Гэтыя вераванні сінтэзаваліся з вераваннямі ў “заложных” пакойнікаў, памерлых несвоечасовай або ненатуральнай смерцю (самагубцы, тапельцы, забітыя, апойцы, чараўнікі, ведзьмары). “Заложныя” пакойнікі, паводле народных вераванняў, знаходзіліся ва ўладзе нячыстай сілы. Яны злыя на жывых і помсцяць ім, нярэдка самі ператвараючыся ў той або іншы від нячыстай сілы.[25] У апавяданні мы маем справу хутчэй за ўсё з апрацоўкай сапраўднай гістарычнай падзеі, нейкай эпідэміі, якая пачалася з Друцка. Тэндэнцыйнасці ў выкладанні легенды не назіраецца, бо яна падаецца сінхронна з рознымі стыхійнымі бедствамі, нашэсцем іншапляменнікаў, што мелі месца на іншых славянскіх землях і якія традыцыйна трактуюцца летапісцам як кара Гасподняя за грахі і няпраўды людскія.

Такім чынам, “Аповесць мінулых гадоў” метадычна перадае рэальныя і легендарныя гістарычныя падзеі, раскрывае праз іх дынамічны працэс хрысціянізацыі ўсходнеславянскай зямлі, уключаючы яе гісторыю ў рэчышча сусветнай, што бачыцца летапісцам адзіным працэсам, пачатак якога – у біблейскім утварэнні свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[23] Никифоровский Н.Я. Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе // Виленский временник. – Вильно, 1907. – Кн. 2.

[24] Янчук Н. По Минской губернии. Заметки поездки в 1886 году // Этнографическое обозрение. – М., 1897. – С. 41 – 42.

[25] Никифоровский Н.Я. Указ. соч. – С. 61 – 62; Токарев С.А. Религиозные верования восточнославянских народов XIX – начала XX в. – М.; Л., 1957. – С.36 – 40.

У канве гістарычных падзей летапісец развівае правідэнцыяльны погляд на гісторыю, адпаведна якому добрае і благое абумоўліваюцца воляй Боскай у пакаранне ці ва ўзнагароду пэўным народам і асобным людзям. Гасподняе пакаранне навядзеннем зла скіравана на аслабленне людзей ад грахоў, на іх выратаванне дзеля вечнага жыцця. У цэлым філасофскія погляды аўтара "Аповесці" вылучаюцца ідэямі тэацэнтрызму: гістарычныя, прыродныя і іншыя з'явы суадносяцца з Богам, вызначаюцца праз Яго і маюць маральна-дыдактычную афарбоўку. Непасрэдна і праз шматлікія паралелі са Старога Запавету і Новага Запавету летапісец імкнецца да дыдактычнага сцвярджэння хрысціянскай маралі, да праслаўлення ўсходнеславянскай зямлі, яе першых хрысціян і пакутнікаў, яе хрысціцеля, усіх новых людзей, якія ўсклалі на сябе подзвіг хрысціянскага служэння Богу.

**П.В.Боянков**, клирик Минского
Свято-Духова Кафедрального собора

## "НАЧАТКІ ПРАВАСЛАЎЯ" – БЕЛОРУССКИЙ ПРАВОСЛАВНЫЙ АЗБУКОВНИК

Книга с предварительным названием "Начаткі Праваслаўя" в настоящее время готовится к печати в издательстве "Полымя". Ее выход будет по-своему символичным и явится конкретным результатом совместной работы православной церкви и соответствующих государственных структур. Средства для ее издания были выделены Государственным комитетом Республики Беларусь по печати, а благословение дано Митрополитом Минским и Слуцким, Патриаршим Экзархом всея Беларуси Филаретом.

В основу книги положены материалы православного катехизиса и месяцеслова, регулярно публиковавшиеся на протяжении 1992 – 1993 гг. в еженедельнике "Беларускае тэлебачанне і радыё" (что для своего времени также было явлением новым и необычным). Все эти публикации готовились совместно с журналистом и переводчиком Л.Н. Качанко – старшим редактором "БТ і Р", которому выражаем искреннюю благодарность и большое удовлетворение от выполненной работы. Затем эти же материалы с некоторыми дополнениями и изменениями составили "Беларускі праваслаўны каляндар" на 1994 г. – первое издание на Беларуси, выпущенное усилиями православных братств во имя Архистратига Божия Михаила и Трех Вилен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ